© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



## Хрысьціянскае веравучэньне — у школы

**Сьледам за Эстоніяй, Літвою, а таксама краінамі Ўсходняй Эўропы ў Латвіі неўзабаве, верагодна, таксама ўключаць у навучальныя праграмы агульнаадукацыйных школаў выкладаньне хрысьціянскага веравучэньня.**

У краіне распрацаваны праект закону пра рэлігійныя арганізацыі, які прадугледжвае «вывучаць у агульнаадукацыйных школах этыку альбо міжканфэсійнае хрысьціянскае веравучэньне». Практычны бок пытаньня ўжо абмеркаваны прадстаўнікамі Міністэрства адукацыі, культуры і навукі, а таксама настаўнікамі.

**Зіеданіс ФРЭЙМАНІС, РІД**

## Маёнтак сям'і Пальмэ перададзены Арміі Выратаваньня

**Сям'я трагічна загінулага прэм'ера Швэцыі Улафа Пальмэ — брат, сястра і трое сыноў — перадала на мінулым тыдні свой фамільны маёнтак Скангале, што разьмяшчаецца паблізу горада Ліепая ў Латвіі, прадстаўнікам мясцовай Арміі Выратаваньня.**

Уладаньні сям'і Пальмэ, якія складаюцца зь вялікага двара і 52 гектараў парку, былі сканфіскаваныя савецкімі ўладамі ў 1940 г. і былі вернутыя законным уладальнікам толькі ў 1993 г., пасьля аднаўленьня незалежнай Латвіі. Сям'я Пальмэ вырашыла цяпер перадаць іх на дабрачынныя мэты.

Армія Выратаваньня мае намер разьмясьціць у маёнтку асьветна-культурны цэнтар. Але разбураны паўстагодзьдзя таму двор перш вымагае рэмонту. У Скангале нарадзілася маці Улафа Пальмэ, што належала да шматлікай швэдзкай калёніі ў Латвіі, а сам ён праводзіў там вакацыі ў 1920-30 гг.

**Паводле матэрыялаў замежнага друку**

## Латвія не шкадуе пра аддзяленьне ад рублёвай зоны

**Жорсткая манэтарная палітыка і высокі курс лата ў стасунку да даляра абсалютна апраўданыя ў цяперашніх умовах. Пра гэта заявіў «хросны бацька» манэтарнай палітыкі Латвіі, замежны сябра Латвійскай Акадэміі навук, прафэсар Джорджтаўнскага ўніверсытэту Юрыс Віксыньш.**

На думку прафэсара, цьвёрды курс лата, што ўтрымліваўся летась Банкам Латвіі, спрычыніўся да таго, што нацыянальная валюта гэтай краіны ўвайшла ў лік наймацнейшых валютаў сьвету. Гэта пацьвярджаецца фактамі: за 1993 г. японская ена павялічыла кошт у дачыненьні да даляра толькі на 10%, тымчасам як лат — ажно на 30%.

Сп. Віксыньш адзначыў, што сёньня можна назіраць прыток капіталу ў Латвію. Вяртаюцца з-за мяжы грошы латвійскіх бізнэсмэнаў, прыхаваныя раней у банках Швайцарыі й Швэцыі. Зьявіўся давер да латвійскай фінансавай сыстэмы ў замежных інвэстараў, чые крэдыты пайшлі ў камэрцыйныя банкі.

На імідж Банку Латвіі працуюць і іншыя ягоныя дасягненьні: пасьпяховае аддзяленьне ад рублёвай зоны, развіцьцё інструмэнтаў кантролю, канвэртавальнасьць нацыянальнае валюты. Ёсьць нагода для гонару: раз-пораз курс лата друкуецца ў лёнданскай *Financial Times*.

Прафэсар мяркуе, што сёлета інфляцыя ў Латвіі будзе вышэйшая, чым у ЗША, але ўжо ў другой палове году прагназуецца рост валавога нацыянальнага прадукту. Становішча на харчовым рынку палепшыцца не раней як праз два гады за кошт зьяўленьня мясцовых танных тавараў. Эўрапейскі ўзровень жыцьця, на думку прафэсара з ЗША, рэальны толькі праз 20—25 гадоў.

**Паводле матар'ялаў замежнага друку**

## Невыкрадальныя машыны

**Нядаўна па ўсёй Латвіі распачалася супрацьугонная маркіроўка аўтамабіляў.**

Меткі, якія наносяцца на машыны, бываюць бачныя і нябачныя, але зьнішчыць іх для выкрадальніка — справа надта цяжкая і дарагая. Перафарбаваць машыну, зьмяніць лабавое шкло і нумары — усё адно, што не зрабіць нічога. Каб зьлiквідаваць усе меткі, трэба ледзь не перарабіць усю машыну нанова. А калі застанецца хоць адна, ідэнтыфікаваць аўто будзе вельмі лёгка. Адразу ж пасьля выкраданьня, кліент павінен патэлефанаваць у фірму, якая ставіла меткі, а там спрацоўвае наступны мэханізм: інфармацыя адразу ж ідзе ў паліцыю, памежнікам і ў маскоўскі офіс фірмы, а адтуль, праз спадарожнік TELECOM — па ўсіх краінах, дзе працуе гэтая фірма: ад Калінінграда да Уладзівастока. Астатняе залежыць ад паліцэйскай тэхнікі.

**В.Л.**

## Фіны заводзяць «працоўныя кніжкі»

**Выяўляецца, што ня толькі ў Беларусі маюць намер увесьці новыя пашпарты.**

У Фінляндыі таксама плянуюць выдаваць грамадзянам новы дакумант — рабочы пашпарт. Ён нечым нагадвае працоўную кніжку савецкага ўзору. Міжнародны цэнтар такіх рабочых пашпартоў месьціцца якраз у Фінляндыі. Аналягічны ствараецца ў Нямеччыне. У Эстоніі таксама думаюць пра ўкараненьне падобнага пашпарту. Ён, вядома ж, не заменіць звычайны пашпарт і будзе выдавацца не бясплатна.

У рабочы пашпарт заносяцца ня толькі пашпартныя, але й прафэсійныя зьвесткі. Апрача таго, фіксуюцца ранейшыя мейсцы працы, заносяцца рэкамэндацыі. У Фінляндыі мяркуюць, што ў наш час міграцыі працоўнае сілы такі рабочы пашпарт неабходны для найму на працу па-за межамі краіны жыхарства.

**В.Ш.**

## «Шэры» сэктар расьце

Калі амэрыканец або ангелец чуе, што сярэдні месячны заробак у Баўгарыі складае 135 даляраў, у Чэхіі — 215, у Вугоршчыне — 307, у Польшчы — 180, у Румыніі — 81 і ў Расеі — 86 [у Беларусі — 23 даляры. — Заўв. пер-ракл.], дык яму бывае цяжка зразумець, як на такую суму можна выжыць. Зьдзіўленьне будзе яшчэ большае, калі яму сказаць, што на гэтыя грошы можна ня толькі існаваць самому, але і ўтрымліваць сям'ю, дом, купіць для яго абсталяваньне, аўтамабіль, а таксама выжджаць на адпачынак у межах краіны і за мяжу. Такія цуды даволі пашыраныя ў краінах былога сацыялістычнага блёку, і ня ўсё тут можна растлумачыць ніжэйшым, чым на Захадзе, узроўнем цэнаў.

У былым Савецкім Саюзе 14% людзей працуюць паўлегальна. У Сэрбіі й Чарнагорыі ў 1992 г. «шэрая» эканоміка выпрацоўвала 41% грамадзкага прадукту (ВНП без паслугаў). Зараз гэта будзе, напэўна, ужо 70%. За апошнія гады падобныя паказьнікі ў краінах Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы шпарка расьлі. У Маскве заможныя масквічы ядуць бургеры й фрыткі ў McDonalds'е, а за ягоным парогам, праз некалькі мэтраў, каля станцыі мэтро сотні кабетаў прадаюць усё, што ім удалося здабыць: садавіну, гародніну, цыгарэты, старыя кніжкі. Шмат хто зь іх ня выжыў бы без дадатковага даходу. На вуліцы ці ня кожная машына можа стаць таксоўкай, калі вы маеце даляры.

У Летуве «шэры» сэктар эканомікі дае палову агульнае вартасьці прамысловай прадукцыі і паслугаў. Сярэдні заробак тут складае 150 літаў (37,5 USD) і толькі 80 літаў у правінцыі. Дэпутаты парляманту атрымліваюць 240 літаў. Калі б людзі болей нічога не зараблялі, то яны практычна нічога не змаглі б сабе дазволіць. Кілаграм добрай каўбасы каштуе 20 літаў, красоўкі Adidas — 300 літаў ці болей, а новы аўтамабіль «Лада» — 26000 літаў (14 гадоў працы пры сярэднім заробку).

Некаторыя сьцьвярджаюць, што «шэры» сэктар існуе ня толькі таму, што людзі намагаюцца перажыць цяжкія часіны. Аптымісты мяркуюць, што «шэрая паласа» — гэта кузьня прадпрымальніцтва, і тыя, што зь яе выходзяць, будуць надалей мець легальны бізнэс і плаціць усе падаткі.

**Паводле газэты *Polityka***

**Доля "шэрага сэктара" эканомікі ў валавым нацыянальным прадукце (%)**




### Праграма 8-га каналу з 31 траўня па 5 чэрвеня

**Аўторак, 31 траўня**
18.00 Для дзяцей: «Карусэль».
18.20 Муз. праграма.
19.00 «Лябірынт правасудзьдзя».
19.50 Студыя «ІНТЭКС» прэзэнтуе: «Навіны».
20.00 Мультсэрыял «Вальтрон».
20.30 Тэлесэрыял «Марэна Кляра». 17 сэрыя.
21.20 Зрабі сабе кар'еру.
21.55 «Справа №643».

**Серада, 1 чэрвеня**
18.00 Для дзяцей: «Карусэль».
18.20 Муз. праграма.
18.50 Журфак БДУ прэзэнтуе.
19.00 «Хіл-стрыт Блюз».
19.50 «Солтэк» прэзэнтуе: «Навіны».
20.00 Мультсэрыял «Вальтрон».
20.30 Тэлесэрыял «Марэна Кляра». 18 сэрыя.
21.20 Астра-кляса.
21.45 «Змагар». Маст. фільм.

**Чацьвер, 2 чэрвеня**
18.00 Для дзяцей: «Карусэль».
18.20 Муз. праграма.
19.00 «Лябірынт правасудзьдзя».
20.00 Мультсэрыял «Вальтрон».
20.30 Тэлесэрыял «Марэна Кляра». 19 сэрыя.
21.25 «Файт». Кікбоксынг.
21.45 Дэтэктыў... Баявік... «Усё адбылося на раўнінах». 3 сэрыі «Шпіён».
22.45 «Foxy music». Паўтор.

**Пятніца, 3 чэрвеня**
18.00 Для дзяцей: «Карусэль».
18.20 Муз. праграма.
18.50 «Солтэк» прэзэнтуе: «Дорэміфасолькі».
19.00 Праграма пра здароўе: «Доктар... Доктар».
19.20 «Лёс». 65 сэрыя.
20.00 Мультсэрыял «Вальтрон».
20.30 Тэлесэрыял «Марэна Кляра». 20 сэрыя.
21.20 Час мясцовы.
21.45 Фантастыка на экране: «Падлеткі ў Сусьвеце».
23.00 Муз. праграма.

**Субота, 4 чэрвеня**
15.00 Мультсэрыял «Трансформэры».
15.20 Праграма пра здароўе: «Доктар... Доктар».
16.15 Забаўляльная праграма «Гульня».
17.00 Прапаведнік Кенэт Копленд.
17.30 «Затока Небясьпечная».
18.00 Падарожны журнал: Партугалія. Грэцыя.
18.30 Опра Ўінфры-шоў: «Чаму мы разводзімся».
19.30 «Лёс». 66—67 сэрыі.
21.00 «Солтэк» прэзэнтуе: «Спартовая мазаіка».
21.30 Сем хвілінаў з «Хрыстафорам».
21.40 «Кветка жарсьці». 16—17 сэрыі.
23.10 Муз. праграма.

**Нядзеля, 5 чэрвеня**
15.00 Мультсэрыял «Трансформэры».
15.10 Спартовая паралель.
17.00 Прапаведнік Кенэт Копленд.
17.30 «Постаць забойцы» з цыклу «Зьлягі жыцьця».
18.00 «Солтэк» прэзэнтуе: «Тэлефэн», «Вуліца».
18.30 Дзікая Амэрыка.
19.30 Спорт-сакрэт.
20.00 Камэдыйнае шоў «Схаваная камэра».
20.20 «Кветка жарсьці». 18—20 сэрыі.
22.40 «Foxy music».



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

